**А. А. Карпіевіч**

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА: ГАРЫЗОНТ ЧАКАННЯЎ І ПЕРАДУЗЯТАСЦЬ ЧЫТАЧА

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*karpievitch004@gmail.com;*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дац.*

Мэта артыкула – раскрыць спецыфіку рэцэпцыі беларускай літаратуры праз перадузяты гарызонт чаканняў чытача. Выяўлена, што створаныя міфы пра «вясковасць» і «ваеннасць» нацыянальнай літаратуры перашкаджаюць яе паўнавартаснаму развіццю. Абгрунтавана, што беларуская літаратура знаходзіцца ў стане памежнасці, які праяўляецца тапалагічна (горад і вёска), гістарычна (вайна і пост-вайна) і палітычна (савецкае і постсавецкае мінулае).

***Ключавыя словы***: гарызонт чаканняў; культурная памяць; нацыянальная ідэнтычнасць; перадузятасць чытача; рэсентымент; рэцэпцыя.

Памежны стан беларускай літаратуры заўважаецца шматлікімі даследчыкамі, і гэта звязана з яе сфакусаванасцю на так званай «гістарычнасці». Ханс-Роберт Яўс (*Hans Robert Jauß, 1921–1997*) піша, што гісторыя літаратуры XIX стагоддзя сваім поспехам абавязана перакананню, што ў кожным яе факце «нябачна прысутнічае» ідэя нацыянальнай індывідуальнасці [1, с. 45]. Але далей літаратура спыняецца і не адказвае на патрэбы грамадства, тым самым стварае асобна сучаснае і мінулае. Бездань паміж гэтымі дзвюма часткамі імкнецца запоўніць літаратуразнаўства і яго спрошчаныя мадыфікацыі, напрыклад, школьны курс нацыянальнай літаратуры. Пытанне да праграмы, якую вывучаюць дзеці з 5 па 11 клас, можна ставіць па-рознаму. Па-першае, неабходна адзначыць пэўную скіраванасць падабраных твораў на стварэнне нацыянальнага іміджу Беларусі. Па-другое, гістарычны падыход, які ўжываецца пры падборы твораў, мае зламаную храналагічнасць, бо вучням да 7 класа цяжка ўспрымаць лінейны рух культуры. Гэта звязана з тым, што дагэтуль школьнікі практыкавалі дыяхранічны падыход і хутчэй знаёміліся з базавымі літаратуразнаўчымі азначэннямі. Так, першапачатковае знаёмства з беларускай літаратурай у 5 класе пачынаецца з вывучэння народных казак, прыказак і прымавак, і загадак [2, с. 23–71]. Па-трэцяе, з яўсаўскай інтэрпрэтацыі вынікае, што нацыянальная індывідуальнасць, якую шукаюць у гісторыі літаратуры, стварае прабел паміж сучаснасцю і мінулым.

Фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці адбываецца дзякуючы пераасэнсаванню міфалагічных фігур і сімвалаў, якія склаліся раней. Цяпер стварыць беларускі літаратурны міф цяжэй праз уяўленні чытача аб адсутнасці сучаснага літаратурнага працэсу. Нарэшце, па-чацвёртае, уніфікацыя школьных праграм вядзе да абвастрэння адной з галоўных праблем рэцэптыўнай эстэтыкі – выдаленне інтэрпрэтацыі тэксту чытачом і наступныя імплікацыі [1, с. 58]. Прасцей кажучы, цяжка навучыць школьніка аналізу твора па папярэдне сфарміраваных схемах: знікае першасны кантакт з тэкстам, які абуджае неабходную цікавасць.

Х.-Р. Яўс адзначае, як гарызонт чаканняў чытача здольны змяняцца і карэктавацца годна з яго вопытам у чытанні – так ствараецца жанравая структура твора ў гульнявой прасторы [1, с. 60]. Ідэальны твор мусіць паступова будаваць пэўныя чаканні і затым пасняхова іх разбураць – такім чынам вучыць суб’екта думаць і аналізаваць тэкст на прадмет існавання падвойнага дна. Класічны прыклад – «Дон Кіхот» (*El ingenioso hidalgo Don Quijote de la Mancha, 1605*) Мігеля дэ Сервантэса (*Miguel de Cervantes Saavedra, 1547–1616*): аўтар парадыруе рыцарскія раманы, пакуль чытач не разумее, што адбываецца.

Праблема школьнага курсу беларускай літаратуры заключаецца ў тым, што ён адмыслова будуе гарызонт чаканняў ад літаратуры, але ніводнага разу не разбурае яго. Сур’ёзная праграма разлічана на дыдактычныя мэты выхавання ў дзяцей пачуцця гонару за нацыянальную культуру і запамінання важных падзей у гісторыі краіны. Такім чынам, пасля школьнага курса беларускай літаратуры ў чытача застаюцца акадэмічныя забабоны, адсутнічае іронія над тэкстам (якая ёсць у кожнай эпосе з антычнасці), і фарміруецца ўяўленне аб монатэматычнасці нацыянальных пісьменнікаў. Так узнікае адсутнасць эстэтычнага вопыту – хоць у праграму афіцыйна і ўключаны некаторыя тэксты з сусветнай літаратуры, іх чытанне адыходзіць на задні план, пакуль культурную прастору запаўняе другая буйная традыцыя – руская.

Як піша Вольфганг Ізер (*Wolfgang Iser, 1926–2007*), «жаданне аўтэнтычна выявіць аўтарскі намер, якое гэтак часта выяўлялася ў аўдыторыях і лекцыйных залах, прыводзіла да даследавання душы аўтара або структур яго свядомасці – задачам, якія маюць толькі спекулятыўнае рашэнне» [3, с. 193]. Кожнаму твору ў падручніку беларускай літаратуры папярэднічае невялікі біяграфічны артыкул пра аўтара, што з’яўляецца класічным адлюстраваннем дабартаўскай схемы аналізу твора. Матывацыя змяшчаць верш пра краявіды малой радзімы і звесткі пра жыццё паэта звязана з тым, што гэта адначасова і зніжае і ўзвышае асобу аўтара, прымушае асацыяваць яго з высокім стылем і ўласным досведам. Пафас пазбаўляе твор актуальнасці, якая, у сваю чаргу, фіксуе падзейнасць і абазначае станаўленне ўяўнага ў галіне рэальнага [3, с. 193]. Абгрунтаванне

надзённасці беларускай літаратуры знікае ў момант абвяшчэння замкнёнага кола цыркулюючых тэм.

Перадузяты чытач, дзякуючы функцыянуючай школьнай праграме, бачыць у нацыянальнай літаратуры наступныя тэмы: прыгажосць прыроды, Айчынная вайна і вясковае жыццё. Гэта лейтматывы ўсіх падручнікаў, якімі разважае абывацель. Лірыка адгукаецца ў душы не кожнага, таму суб'ектыўнасць пры яе рэцэпцыі можна спісаць на кагнітыўныя скажэнні. Ваенная тэматыка ўзаемнабалючая для чытача і аўтара. Калі пісьменнік рэфлексуе і стварае фікцыянальны твор, зыходзячы з траўматычнага вопыту (уласнага ці нацыянальнага), то адрасат тэксту можа ўспрымаць кожны такі твор альбо як важны маніфест, альбо як чарговы раман пра вайну. Напісанне і чытанне ў гэтым выпадку становіцца рытуалам – пацверджаннем міфаў пра важнасць спалучэння культурнай і гістарычнай памяці. Але тут міф становіцца сацыяльным, ён семантычна насычаецца і губляе ўласную скіраванасць на грамадзяніна. Суб'екту нецікава чытаць аналагічныя творы на ваенную тэматыку, ён губляе адчувальнасць да іх: гарызонт чаканняў звужаецца і страчваецца эмацыйная падтрымка. У чытача ўзнікае ахоўная рэакцыя ён адмаўляе існаванне твораў на назаляючую тэму, і карыстаецца сінекдахай – адмаўляе ўсю беларускую літаратуру. Парадаксальна, але выключаючы сябе з нацыянальнага культурнага працэсу, беларус павышае ўласную агентнасць і стварае антылітаратурную палітыку. У будучым гэта адгукаецца ва ўсталяванні міфа пра беларускую літаратуру як «ваенную», што прыніжае існаванне іншых тэм [4].

Міф пра беларускую літаратуру як літаратуру пра вёску ўзнікае згодна з аналагічнымі чытацкімі перадузятасцямі. Памежнасць жыцця беларуса праяўляецца і тапалагічна – паміж горадам і вёскай. Для ўрбанізаванай часткі грамадства вясковае жыццё актуалізуецца дзякуючы святам альбо сезонным паездкам за горад. Вяскоўцы маюць пэўны рэсэнтымент *(пад гэтым тэрмінам разумецца пачуццё варожасці і зайдрасці па сацыяльных ці культурных прычынах)* да гарадскога насельніцтва праз першапачаткова лепшыя ўмовы жыцця і больш развітую інфраструктуру і марыць аб пераездзе ў буйны горад альбо сталіцу (часцей за ўсё на вучобу). Гэта спецыфічна посткаланіяльны матыў, у якім праяўляецца эканамічная залежнасць светапогляду людзей, што прыводзіць да існавання культурных зрухаў. З гэтай прычыны размовы пра вясковае мінулае пераасэнсоўваюць траўматычны вопыт розных пластоў насельніцтва і выклікаюць адрозны гарызонт чаканняў. Перадузяты гарадскі суб'ект бачыць у літаратуры пра вёску адбітак неактуальнай для яго сучаснасці: ён апелюе міфамі і сімваламі, якія першасна замацаваны ў каляндарна-рытуальных практыках. Перадузяты вясковы суб'ект альбо трывала асацыюе сябе з героямі, альбо пераадольвае гарызонт чаканняў, не знаходзіць новай літаратурнай

рэцэпцыі дадзенага вопыту і пагардліва экстрапалюе ўласны вопыт на ўсю літаратуру.

Як згадана вышэй, апісаныя чытацкія чаканні замацоўваюцца дзякуючы міфалагізаванаму курсу школьнай нацыянальнай літаратуры. Яна прайграе аналагічнай дамінантнай рускай і першапачаткова знаходзіцца ў стане рэцэсіўнай. Школьная праграма стварае неабходны мінімум для ідэалагічнага і эстэтычнага ўспрыняцця літаратуры, таму мае пэўныя недахопы, ужо апісаныя раней. Важная тэма вайны з'яўляецца ўжо ў шостым класе, і лейтматывам праходзіць скрозь астатнія пяць гадоў навучання. У фікцыянальнай форме міфы пра вайну не ўспрымаюцца дзецьмі маладзей за 11 гадоў, таму яны не ўключаюцца ў курс. Важна адзначыць, што ў 10 класе існуе невялікі пласт літаратуры, звязанай з Першай сусветнай вайной (апавяданні Максіма Гарэцкага *(1893–1938)* [5, с. 152–159]), і рэкамендуюцца творы пісьменнікаў «страчанага пакалення». Аднак асноўная ўвага надаецца антываеннаму пафасу і гераізму маленькага чалавека (пераважна вясковага – гэта звязана з нізкім узроўнем урбанізацыі ў пачатку XX стагоддзя). Па аналагічных схемах разглядаецца і творчасць Янкі Брыля *(1917–2006)*: апавяданне «Memento mori» *(1958)* [6, с. 47–56] выклікана адлюстраваць маральны подзвіг селяніна падчас фашысцкай акупацыі. Часта падкрэсліваецца становішча вяскоўца ў гады савецкай улады: апісваюцца цяжкасці 30-х гадоў і пануючая атмасфера падазронасці – «Макаркавых Волька» Кузьмы Чорны *(1900–1944)* [5, с. 227–241]; выкрываецца драматычны канфлікт заможных сялян падчас калектывізацыі – «Людзі на балоце» Івана Мележа *(1921–1976)* [5, с. 265–281]; разглядаецца станаўленне характараў кіраўнікоў сялянскіх паўстанняў – «Нарач» Максіма Танка *(1912–1995)* [4, с. 74–84] і «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча *(1930–1984)* [6, с. 83–100]); міфалагізуюцца вобразы гістарычных дзеячаў – «Князь Вітаўт» Аляксея Дударава *(1950–2023)* [6, с. 175–183).

Такім чынам, можна заключыць, што рэцэпцыя беларускай літаратуры адбываецца праз перадузяты гарызонт чаканняў чытача. Створаныя міфы пра «вясковасць» і «ваеннасць» нацыянальнай літаратуры перашкаджаюць яе паўнавартаснаму развіццю. Гарызонт чаканняў дэфармуецца і не пашыраецца з-за існавання сацыяльных міфаў пра літаратуру, якія, у сваю чаргу, утвараюцца за кошт кагнітыўных скажэнняў і пачуцця рэсентыменту. Беларуская літаратура знаходзіцца ў стане памежнасці, які праяўляецца тапалагічна (горад і вёска), гістарычна (вайна і пост-вайна) і палітычна (савецкае і постсавецкае мінулае). Папулярызацыя нацыянальнай літаратуры абавязана адбыцца праз зняцце супярэчнасцей паміж чытачом і аўтарам і абавязковае пашырэнне гарызонту чаканняў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

*усс Х. Р.* История литературы как провокация литературоведения. Новое литературное обозрение. 1995. № 12. С. 34–84.
*уковіч М. В.* Беларуская літаратура : вуч. дапаможнік для 5 класа: у 2 ч. / *В. У. Праскаловіч, Л. К. Цітова.* Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2021. Ч. 1.
*зер В.* Акты вымысла, или что фиктивно в фикциональном тексте / Немецкое философское литературоведение наших дней : Антология : пер. с нем.; сост. *Д. Уффельман, К. Шрамм*. СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2001.
*арт Р.* Мифологии. М. : Академический Проект, 2008.
*язлепкіна-Чарнякевіч А. П.* Беларуская літаратура : вуч. дапаможнік для 10 класа / *А. Акушэвіч, І Воюш.* Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020.
*ельнікава З. П.* Беларуская літаратура : вуч. дапаможнік для 11 класа / *Г. М. Іншчанка, І. М. Мішчанчук.* Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2021.